**УДК 947.6** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-67-71**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ПА ВЫРАШЭННІ САЦЫЯЛЬНЫХ І ГРАМАДСКІХ ПЫТАННЯЎ У ВЕСЦЫ Ў ПАЧАТКУ XX СТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ СПРАВАЗДАЧ)

***канд. гіст. навук Г.А. СТРАЛЕНЯ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9689-1367***

*У Расійскай імперыі ў канцы XIX ст. была праведзена рэформа мясцовага кіравання, у ходзе якой была ўведзена новая ўлада ў сельскай мясцовасці – інстытут земскіх начальнікаў. Адным з напрамкаў іх дзейнасці стала вырашэнне асноўных праблем у сялянскім асяроддзі. Земскія начальнікі адказвалі за правядзенне рэвізій органаў сялянскага самакіравання, вырашалі пытанні землеўладкавання, валодалі судовымі паўнамоцтвамі. Акрамя таго, павінны былі садзейнічаць павышэнню пісьменнасці сярод сельскага насельніцтва, адкрыццю новых школ. У артыкуле разглядаецца роля земскіх начальнікаў у вырашэнні сацыяльных і грамадскіх праблем сельскага насельніцтва, паказана іх практычная дзейнасць, накіраваная на павышэнне ўзроўню пісьменнасці, змяненне стаўлення сялян да атрымання адукацыі.*

***Ключавыя словы**: земскія начальнікі, адміністрацыйныя і судовыя ўстановы, беларускія губерні, сялянскае самакіраванне, адукацыя.*

**Уводзіны.** Грамадскае жыццё беларускай вёскі напачатку XX ст. было звязана з мноствам знешніх і ўнутранных чыннікаў, якія абумовілі пераход ад традыцыйнага грамадства. У гэты перыяд адбываюцца значныя змены ў жыцці беларускага сялянства, у тым ліку, разбураюцца традыцыйныя нормы і каштоўнасці, змяняецца светапогляд, стаўленне да адукацыі. Разам з тым, важную ролю ў сялянскай паўсядзённасці займалі пазямельныя пытанні, адносіны з вясковай адміністрацыяй і вырашэнне бытавых праблем. Сачыць за вырашэннем, у тым ліку, і некаторых паўсядзённых пытанняў, павінны былі земскія начальнікі, якім у пачатку XX ст. адводзілася значная роля ў сацыяльным і гаспадарчым жыцці вёскі. У пасадзе земскага начальніка спалучаліся адміністрацыйныя і судовыя паўномоцтвы. Кола іх абавязкаў было вельмі шырокім. Да ліку функцый адносіўся кантроль органаў сялянскага самакіравання, выдаткаў грашовых сродкаў, стану мірскіх капіталаў, у іх кампетэнцыю ўваходзіла назіранне за нядоімкамі, размеркаваннем падаткаў і збораў, прынятце мер па забеспячэнні жыхароў участка харчаваннем, падрыхтоўка звестак аб прадастаўленні льгот па падатках і зборах. Да абавязкаў земскіх начальнікаў адносіліся таксама функцыі судовай інстанцыі: яны разглядалі як грамадзянскія, так і некаторыя крымінальныя справы [1, с. 513–525].

Сярод пытанняў сацыяльнага і грамадскага жыцця, якія павінны былі вырашаць земскія начальнікі, можна вылучыць некалькі накірункаў. У іх абавязкі ўваходзіла арганізацыя дапамогі сялянам, якія апынуліся ў нястачы. У гэтым накірунку асаблівае значэнне адводзілася прафілактычным мерам і арганізацыі дапамогі насельніцтву ў выпадку неўраджаяў, пажараў, стыхійных бедстваў і г.д. Да ліку функцый мясцовай улады адносіўся таксама пастаянны кантроль за выкананнем пажарных нормаў і паляпшэннем санітарна-гігіенічнага стану ў вёсках, мерапрыемствы па прафілактыцы эпідэмій інфекцыйных захворванняў. Важнае месца займала і адукацыйная справа, у іх функцыі ўваходзілі пытанні павышэння ўзроўню адукацыі сялян. У сувязі з неабходнасцю вырашэння гэтых пытанняў земскія начальнікі былі ўведзены ў склад рэвізійных камісій разам з прадстаўнікамі іншых ведамстваў, у тым ліку ўчастковымі інспектарамі народных вучылішчаў, сельскімі лекарамі, санітарнай інспекцыяй, прыставамі і г.д. Прапановы па пытаннях, якія патрабавалі матэрыяльных выдаткаў з боку сельскіх жыхароў, земскія начальнікі павінны былі выносіць на абмеркаванне валасных і сельскіх сходаў.

Мэта даследавання – вызначыць ролю земскіх начальнікаў у вырашэнні сацыяльных і грамадскіх пытанняў сельскага насельніцтва, паказаць іх практычную дзейнасць па павышэнні ўзроўню пісьменнасці ў беларускай вёсцы.

**Асноўная частка.** Грамадскае жыццё нельга ўявіць без ўзаемаадносін сялян і органаў самакіравання, кантроль якіх таксама быў ускладзены на земскіх начальнікаў. Ад таго, як была пастаўлена праца ўстаноў самакіравання, залежала вырашэнне шматлікіх пытанняў сялянскага паўсядзённага жыцця.

Рэалізацыя адміністрацыйных абавязкаў земскіх начальнікаў, куды ўваходзілі таксама і паўнамоцтвы па паляпшэнні сацыяльнага і гаспадарчага жыцця, адлюстраваны ў справаздачах. Справаздачы за кастрычнік 1901 – студзень 1903 гг. выклікаюць цікавасць яшчэ і таму, што земскія начальнікі Мінскай губерні толькі пачалі сваю працу. Неабходна адзначыць і тое, што на першапачатковым этапе сваёй дзейнасці новыя ўлады дынамічна ўзяліся за ўладкаванне сялянскага самакіравання. Гэта выклікана тымі абставінамі, што іх праца была непасрэдна звязана з неабходнасцю ўзаемадзеяння з валаснай і сельскай адміністрацыяй, валаснымі судамі.

***Грамадскае жыццё.*** У сувязі з гэтым адразу пасля заступлення на пасаду многія земскія начальнікі актыўна выкарыстоўвалі элементы кантролю над вясковым самакіраваннем і судом, якія былі нададзены ім заканадаўча. Напрыклад, земскі начальнік 3-га ўчастка Мінскага павета Дз.І. Пацёмкін за перыяд з кастрычніка 1901 г. па студзень 1903 г. атрымаў 73 адміністрацыйныя справы, з якіх было вырашана 68 спраў. Ён разгледзеў 14 скаргаў на валасных старшын (2 – на суддзяў, 2 – на наглядчыкаў хлебазапасных крам, 3 – на пісараў, 13 – на сельскіх

старастаў). Сярод іх былі прызнаны грунтоўнымі: 1 скарга на валаснога старшыню, 1 на валаснога суддзю, 2 на наглядчыкаў крамы і 2 на сельскіх старастаў. У якасці пакаранняў штраф атрымалі суддзя і наглядчык крамы, вымову – валасны старшына, а таксама былі зняты з пасады 2 сельскія старасты. Па асабістым меркаванні земскага начальніка былі аштрафаваныя 1 пісар і 4 валасныя старшыны, зняты з пасады пісар і валасны старшына. Неабходна адзначыць, што Дз.І. Пацёмкін адказна выконваў свае адміністрацыйныя функцыі, ён правеў 7 рэвізій валасных судоў за 1901–1902 гг. і падаў падрабязную справаздачу аб працы валасных суддзяў у павятовы з'езд, дзе былі адзначаны агульныя недахопы ў іх працы. Так, напрыклад, у некаторых рашэннях па крымінальных справах не былі пазначаны артыкулы Статута аб пакараннях, у пратаколах грамадзянскіх спраў адсутнічалі акты мясцовага агляду, справаводства вялося неахайна. Земскі начальнік адзначыў, што напачатку года справаводства вялося вельмі павольна, паколькі валасны пісар вёў нецвярозы лад жыцця, што і стала прычынай яго адхілення ад пасады. Валасны старшына быў адхілены ад пасады за растрату грашовых сродкаў [2, л. 15–17]. Падобныя меры ў адносінах да валаснога самакіравання дапамагалі больш хуткаму і якаснаму вырашэнню розных сацыяльных праблем, з якімі сутыкаліся вяскоўцы.

Вырашэнне праблем з вясковай адміністрацыяй і судом, уладкаванне пазямельных пытанняў садзейнічалі росту аўтарытэта земскага начальніка сярод сялян і дапамагалі яму ў вырашэнні пытанняў грамадскага жыцця. Гэта асабліва падкрэсліваў земскі начальнік 5-га ўчастка Мінскага павета М.Г. Лявіцкі, які паставіў сабе за мэту выкараніць хабарніцтва. Ён адзначыў, што «раскрытие вышеуказанных злоупотреблений, произведших силное впечатление на крестьян, имело и имеет немалое значение. Благодаря этому престиж земского начальника растет в глазах народа, а с тем прогрессивно возрастает и доверие крестьянина к поставленному над ним начальству. Крестьяне теперь уже на встречу идут благим намерениям начальства, когда при введении института земских начальников оказывали очевидно благой мере непонятно сильное сопротивление» [2, л. 19]. М.Г. Лявіцкаму ўдалося выкрыць хабарніцтва з боку Івянецкага валаснога праўлення, прычым адміністрацыйныя асобы бралі хабар з абодвух бакоў судовага працэсу і абяцалі выйграць справу ў валасным судзе. Такое стаўленне да сялянскіх праблем дапамагла яму наладзіць адносіны з мясцовым сялянствам. Ён адзначыў у справаздачы, што напачатку дзейнасці многія яго прапановы аб пабудове школы, брукаванні мястэчка і г.д. адразу ж былі адхіленыя сялянамі. Пасля таго як ён праявіў сябе ў якасці годнага кіраўніка, сяляне самі адпусцілі сродкі і папрасілі яго прыняць меры для пашырэння Рубяжэвіцкага народнага вучылішча, пабудовы школы і дастаўцы каменя для ўладкавання маставых у мястэчках. На думку земскага начальніка, недавер і непавага сялян да службовых асоб выклікана валасным начальствам, якое складаецца, пераважна, з неадукаваных і непісьменных асоб небездакорнай маральнасці. Акрамя таго, М.Г. Лявіцкі вельмі старанна праводзіў рэвізіі справаводства валасных праўленняў, было праверана справаводства па прызыву і ўліку запасных ніжніх чыноў, па пастаўцы коней у ваенны час, а таксама рэвізіі грашовых сум і кніг валаснога праўлення, справаводства валаснога суда. Земскі начальнік знаходзіў недакладнасці да 1 капейкі, сярод заўваг ён занатаваў, што «в книге прихода и расхода мирских сумм волостного правления найдено, что в расходе начиная с 12 листа цифра расхода показана на 1 копейку менее, но в транспорте на 15 листе эта неправильность исправлена подчисткой цифры, а следует исправлять красными чернилами» [2, л. 25].

Земскі начальнік дасканала правяраў справаводства валасных праўленняў і судоў, у тым ліку і прыходна-расходныя кнігі. Справаводства пяршайскага валаснога праўлення ён знайшоў у добрым стане. А вось праверка 27 верасня 1902 г. прыходна-расходных кніг і справаводства рубяжэвіцкага валаснога праўлення выявіла сур'ёзныя недахопы: грашовыя кнігі, за выключэннем прыходна-расходных, вяліся з памылкамі, а некаторыя не былі пачаты з 1 студзеня 1902 г. Па выніках рэвізіі земскі начальнік пастанавіў выправіць усе недахопы і не дапускаць іх у будучыні і «налажить на Рубежевиского волостного писаря Ивана Нарцевича за нерадивость в делопроизводстве на основании 62 статьи Положения о земских начальниках 4-х рублевый штраф» [2, л. 29].

Адной з асноўных форм кантролю дзейнасці валаснога і сялянскага самакіравання з'яўлялася правядзенне рэвізій, падчас якіх неабходна было таксама патлумачыць правільнасць выкарыстання тых ці іншых заканадаўчых актаў. Гэта было асабліва актуальным, улічваючы, што некаторыя прадстаўнікі сялянскага самакіравання былі непісьменнымі. Так, земскі начальнік 1-га ўчастка Ігуменскага павета М.М. Цімафееў, нягледзячы на вялікую колькасць скаргаў у адрас валасных старшын (43 скаргі з кастрычніка 1901 г. па студзень 1903 г.), адзначыў, што справаводства валасных праўленняў вядзецца без нараканняў, а недахопы былі нязначныя і адбываліся ў большасці выпадкаў ад недакладнага разумення пісарамі новых правілаў судаводства. Земскі начальнік падкрэсліў, што ён абмяжоўваўся толькі тлумачэннямі на словах і пры наступнай рэвізіі выяўленыя хібы былі выпраўленымі. Ён таксама заўважыў, што «1902 год введения в Минской губернии реформы крестьянских учреждений, с преобразованием судопроизводства, нового порядка обложения населения продовольственной повинностью и другими новыми порядками, был весьма тяжелым для заведовавших делопроизводством волостных правлений и нельзя обойти молчанием того обстоятельства, что волостные писари справились со своей задачей успешно» [3, л. 6]. А, напрыклад, земскі начальнік 6-га ўчастка Рэчыцкага павета А.А. Госа за справаздачны перыяд правёў 11 рэвізій валасных праўленняў і судоў. Недахопы былі выяўлены ім пры вядзенні апякунскіх спраў, якія знаходзіліся ў бязладным стане. Фінансавая дзейнасць была знойдзена земскім начальнікам правільнай. Справаздачы валасных суддзяў таксама знойдзены здавальняючымі. Ён адзначыў, што скаргаў на выкананне валаснымі суддзямі службовых абавязкаў не паступала, а дзве скаргі, названыя ў справаздачы, былі пададзены на іх пазаслужбовую дзейнасць [4, л. 15]. Земскі начальнік 2-га ўчастка Слуцкага павета П.Д. Лаўрыненка-Мішчанка па выніках рэвізіі валасных судоў адзначыў наступныя заўвагі: грамадзянскія пазовы былі змешаныя з крымінальнымі, пакаранні прысуджаліся ісцам без падставы на тое, са сведак валасны суд спаганяў як з адказчыкаў [5, л. 7].

***Адукацыйная справа***. Прадметам ведамства земскіх начальнікаў стала і адукацыйная сфера. У іх абавязкі ўваходзіла правядзенне рэвізій адукацыйных устаноў, кантроль за ліквідацыяй выяўленых недахопаў, садзейнічанне адкрыццю новых школ і вучылішчаў. Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі 8 чэрвеня 1902 г. звярнуўся з прашэннем да мінскага губернатара М.М. Трубецкага аб арганізацыі агляду санітарна-гігіенічных норм сельскіх вучылішчаў Мінскай губерні. У камісію па аглядзе павінны былі ўваходзіць участковы доктар, інспектар народных вучылішчаў і земскі начальнік. Ён таксама прасіў усталяваць для гэтага пэўны тэрмін [6, л. 706]. Так, у адну з камісій Мазырскага павета ўваходзілі: земскі начальнік 3-га ўчастка Мазырскага павета А.Л. Берло, доктар А.П. Данілевіч і інспектар І.В. Любіцкі У справаздачы аб рэвізіі Буйнавіцкага народнага вучылішча земскі начальнік адзначыў наступныя недахопы: вучылішча разлічана на 23 вучня, а наведвалі яго на момант рэвізіі 52 асобы. Санітарна-гігіенічны стан таксама быў прызнаны нездавальняючым. Да прыкладу, для вентыляцыі памяшкання была толькі адна фортачка. Камісія прыйшла да высновы аб неабходнасці правесці рамонт у вучнёўскім інтэрнаце з перакладкай печы і зрабіць капітальны рамонт лазні [6, л. 420].

Земскія начальнікі не толькі павінны былі сачыць за станам школ і вучылішчаў, але і прымаць меры па яго паляпшэнні. У сувязі з гэтым па прапанове земскага начальніка 5-га ўчастка Мазырскага павета Г.А. Фёдарава для школ у вёсках Альшаны і Лядцы былі набыты чароўныя ліхтары з карцінамі і школьныя бібліятэкі, а таксама набыты чароўны ліхтар у Давыд-Гарадоцкае народнае вучылішча, а затым куплена бібліятэка для Велямічскай царкоўна-прыходскай школы [7, л. 13]. На 6-м участку Мазырскага павета, як адзначыў земскі начальнік М.В. Полазаў, ленінскім валасным сходам складзены прысуд аб пераўтварэнні народнага вучылішча ў двухкласнае сельскае вучылішча. Гэты прысуд быў зацверджаны мінскай дырэкцыяй народных вучылішчаў і ўзбуджана хадайніцтва для яго вырашэння перад папячыцелем Віленскай акругі. Акрамя таго, былі складзены прысуды аб адкрыцці ў вёсцы Морач Ленінскай воласці і весцы Пухавічы Жыткавіцкай воласці народных вучылішчаў, і ў сяле Князь-возеры Дзякавіцкай воласці царкоўна-прыходскай школы. Земскі начальнік 3-га ўчастка Ігуменскага павета А.А. Міхельсон таксама надаваў увагу паляпшэнню адукацыйнай справы. Па яго прапанове былі адрамантаваны Астроўскае, Клічаўскае, Коўбчанское народныя вучылішча, у вёсцы Ляды Якшыцкай воласці было пабудавана новае народнае вучылішча, зроблены рамонт царкоўна-парафіяльнай школы [3, л. 12].

Дастаткова актыўная праца земскіх начальнікаў у гэтым накірунку сведчыла таксама і аб змяненні стаўлення сялян да атрымання адукацыі. А.Г. Каханоўскі адзначае сярод паказчыкаў працэса разлажэння традыцыйных каштоўнасцей ў пачатку ХХ ст. пашырэнне пісьменнасці і пэўны рост якасці адукацыі сярод сялян [8, с. 84]. Так, на 2-м участку Слуцкага павета за 1901–1902 гг. было адкрыта два новых вучылішчы, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Міністэрству народнай асветы, таксама быў складзены прысуд царэўскага валаснога сходу аб адкрыцці двухкласнага народнага вучылішча і пабудове для гэтага новага каменнага будынку. На сходзе было зацверджана рашэнне аб прыбудове яшчэ аднаго класа пры Старобінскім народным вучылішчы, паколькі за гэты перыяд жадаючых паступаць у вучылішча было звыш 300 чалавек. Быў складзены прысуд аб адкрыцці 2 царкоўна-прыходскіх школ і адкрыты бібліятэкі пры 6 міністэрскіх вучылішчах [5, л. 8].

***Уладкаванне сацыяльных пытанняў.*** У абавязкі органаў сялянскага кіравання ўваходзіла не толькі правядзенне рэвізій і кантроль над дзейнасцю сельскіх і валасных службовых асоб, але і апека над маральным станам сялян. Так, напрыклад, земскі начальнік 3-га ўчастка Мазырскага павета А.Л. Берло сачыў за маральнымі якасцямі сялян «путем воспрещения публичного пьянства, лотерей и других азартных игр на ярмарках» [7, л. 9].

У сваёй справаздачы земскі начальнік 4-га ўчастка Барысаўскага павета М.А. Чэкан адзначыў, што асаблівую ўвагу ў сваёй працы ён надаў уладкаванню і рамонту грамадскіх будынкаў. За 1901–1902 гг. праведзены рамонт будынка валасных праўленняў, хлебазапасных крам, прыведзены ў прыдатны стан арыштанцкія памяшканні з уладкаваннем у іх асобных аддзяленняў для мужчын і жанчын, а ў весцы Вялікія Рольцы для гэтай мэты было пабудавана новае памяшканне. Неабходна адзначыць, што гэта было зроблена сродкамі сялян. У адносную прыдатнасць былі прыведзены чатыры вялікіх масты і наогул усе дарогі. Увага земскім начальнікам была звернута і на справу адукацыі: у прыватнасці, была адкрыта школа ў в. Асецішча Бярэзінскай воласці, сярод сялян вялася агітацыя адкрыцця ясляў-прытулку. Праводзілася праца па ўтрыманні ў працоўным стане дымавых труб, а таксама пільнаваўся санітарны стан паселішчаў [9, л. 16].

Як адзначалася, земскімі начальнікамі была звернута ўвага на пытанне ўладкавання турэмных памяшканняў, якія ці наогул адсутнічалі ў шматлікіх валасцях, ці знаходзіліся ў непрыдатным стане, ці мелі толькі адно агульнае памяшканне для ўтрымання і мужчын, і жанчын. Так, па прапанове земскага начальніка 3-га ўчастка Ігуменскага павета А.А. Міхельсона былі прыведзены ў парадак арыштанцкія памяшканні і падзелены на два аддзяленні для мужчын і жанчын [3, л. 12]. Уладкаваннем турэмных памяшканняў займаўся і земскі начальнік 1-га ўчастка Слуцкага павета П.І. Бельчанка. Ім была звернута ўвага на неабходнасць уладкавання сельскіх турмаў, якіх пры валасцях не было (за выключэннем Грэскай, дзе мелася памяшканне толькі для мужчын). Гэтыя памяшканні былі ўладкаваныя да студзеня 1902 г. [5, л. 5].

Акрамя таго, значная ўвага мясцовых ўлад павінна была надавацца паляпшэнню санітарна-гігіенічнага стану ў вёсках, у тым ліку прафілактыцы інфекцыйных захворванняў. Для гэтага неабходна было уладкоўваць бальніцы, запрашаць дактароў, тлумачыць важнасць прафілактычных мер, сачыць за станам калодзежаў. Так, па прапанове земскага начальніка 6-га ўчастка Мазырскага павета М.В. Полазава было ўзбуджана хадайніцтва аб камандзіраванні доктара для барацьбы з натуральнай воспай, якая з'явілася ў вёсцы Белае Жыткавіцкай воласці.

Гэта хадайніцтва было задаволена. У Крукавіцкай воласці Рэчыцкага павета па прапанове земскага начальніка была набыта пажарная тэхніка і пабудавана памяшканне для фельчара з прыёмным пакоем [4, л. 15]. У сваёй справаздачы земскі начальнік 2-га ўчастка Слуцкага павета П.Д. Лаўрыненка-Мішчанка адзначыў, што валасным сходам быў складзены прысуд аб адкрыцці сельскай бальніцы ў мястэчку Старобін на 8 ложкаў, на якую палова грошай была асігнавана сялянамі, а палова – памешчыкамі. На перыяд справаздачы быў запрошаны доктар і знойдзена памяшканне. Бальніцу планавалася адкрыць, як падкрэсліў П.Д. Лаўрыненка-Мішчанка, як толькі губернатар дасць дазвол. Земскі начальнік таксама лічыў, што «в недалёком будущем, когда крестьяне увидят всю пользу от учреждения больницы, когда таким образом устранится эксплуатация их фельдшерами, знахарями и бабками, берущими с них последнюю копейку и в тоже время нисколько не облегчающих их страданий» [5, л. 9].

Земскім начальнікам 1–га ўчастка Слуцкага павета П.І. Бельчанка было загадана валаснай і сельскай адміністрацыі звярнуць увагу на ўладкаванне калодзежаў у паселішчах. Пры гэтым неабходна было зрабіць зрубы дастаткова высокімі, а вёдры пры іх прыкаваць, усталяваўшы зверху перакладзіны, каб жывёла не магла з іх піць. П.І. Бельчанка асабіста растлумачыў неабходнасць такіх дзеянняў на сходах, калі адбываўся выбар валасных суддзяў. Гэтак жа была растлумачана важнасць чысткі труб не радзей двух разоў у месяц. Абавязак сачыць за выкананнем гэтых рашэнняў быў ускладзены на стараст, старшын і санітараў [5, л. 4]. У сваёй справаздачы земскі начальнік адзначаў, што распараджэнне адносна калодзежаў не ўсюды яшчэ было выканана. Ён таксама заўважыў, што «проехав по участку я нашел дороги не исправными и циркулярами своими от 2 июня за № 1226 приказал привести дороги в порядок, было донесено, что дороги исправны, но в действительности оказалась, что они исправлены не надлежащим образом. Поэтому 8 июля за № 1798 предписано исправить дороги, особенно между Слуцком и Грозовом капитально. Но из-за полевых работ и неблагоприятной погоды ремонт отложен до весны 1903 г.» [5, л. 5].

Меры па прафілактыцы і дапамозе пры пажарах займалі значнае месца ў вырашэнні сацыяльна-бытавых пытанняў. Па прапанове земскага начальніка 6-га ўчастка Мазырскага павета заснаваны дзве вольна-пажарныя дружыны ў вёсцы Жыткавічы той жа воласці і мястэчку Ленін Ленінскай воласці. Сельскімі грамадамі складзеныя прысуды аб набыцці пажарных інструментаў і помпаў, а таксама арганізаваны пажарныя абозы. Распачата хадайніцтва аб пабудове двух мастоў у мястэчку Ленін праз раку Случ і возера даўжынёю 50 і 20 сажняў. Гэта хадайніцтва было задаволена мінскім губернскім распарадчым камітэтам [7, л. 14–16]. На 2-м участку Слуцкага павета П.Д. Лаўрыненка-Мішчанка таксама прыняў меры па змяншэнні колькасці пажараў і суцэльнага выгарання паселішчаў. Было зроблена распараджэнне аб насаджэнні вакол сялянскіх сядзіб дрэў. З 1903 г. былі наняты камінары для ачысткі труб. Па загаду земскага начальніка былі прыведзены ў парадак наяўныя пажарныя абозы і заснаваны начныя абыходы. Ён таксама забараніў рабіць новыя пабудовы без узаконеных разрываў (пабудовы павінны былі знаходзіцца на неабходнай адлегласці адзін ад аднаго) [5, л. 9].

Асаблівая ўвага пры вырашэнні сацыяльна-бытавых праблем надавалася аказанню дапамогі ў выпадку неўраджаяў, пажараў, стыхійных бедстваў і г.д. Сваечасова прынятыя меры дапамагалі сялянам выйсці са складанага становішча, пазбегнуць голада і нястачы. Так, на 4-м участку Барысаўскага павета напрацягу вясны 1902 г. было выдадзена сялянам 1476 харчовых пазыкі з хлебазапасных крам на 9840 пудоў азімага і 13 887 яравога хлеба. Такі лік пазык земскі начальнік Дз.Л. Фуфаеўскі патлумачыў неўраджаем папярэдняга 1901 г. і «чрезвычайно трудной для сельских хозяев зимой и весной, во множестве случаев на корм скоту шла солома с крыш» [9, л. 16].

Неабходна адзначыць, што рэчаіснасць не заўсёды адпавядала таму, як яе апісвалі ў сваіх справаздачах земскія начальнікі. Якасць вырашэння гэтых пытанняў шмат у чым залежала ад суб'ектыўных характарыстык земскіх начальнікаў, паколькі уладкаванне сялянскага побыту, нагляд за санітарна-бытавым станам, рашэнне адукацыйных пытанняў на практыцы не адносілі да галоўных абавязкаў мясцовай улады. На першае месца выходзілі судовыя функцыі, пазямельнае ўладкаванне сялян, кантроль выплат падаткаў. У сувязі з гэтым адным з асноўных крытэрыяў ацэнкі працы органаў сялянскага самакіравання з боку земскіх начальнікаў таксама стаў паказчык збору падаткаў. Рэвізіі справаводства саміх земскіх начальнікаў неаднаразова вызначалі недахопы ў іх дзейнасці, у тым ліку, звязаныя з вырашэннем значных сацыяльных і грамадскіх пытанняў, пытанняў адукацыі. Так, земскі начальнік 2-га ўчастка Пінскага павета, які пры наяўнасці эпідэміі халеры ў суседнім Мазырскім павеце не праводзіў ніякіх супрацьхалерных мерапрыемстваў на сваім участку, нягледзячы на цыркуляры губернатара і санітарных камісій. Нават высланыя брашуры для распаўсюджвання сярод насельніцтва засталіся ляжаць у канцылярыі земскага начальніка [10, с. 3-4]. Акрамя таго, у прадпісаннях за 1904 г. павятовыя з'езды Мінскай губерні адзначалі недастатковую працу земскіх начальнікаў па выкананні цыркуляра аб прадастаўленні звестак для аказання харчовай дапамогі сельскаму насельніцтву [11, л. 25–31].

**Заключэнне.** У адміністрацыйнай дзейнасці земскіх начальнікаў ўвага надавалася вырашэнню сацыяльных пытанняў жыцця сельскіх жыхароў. У прыватнасці, у іх кампетэнцыю ўваходзілі меры па ўладкаванні сялянскага побыту, арганізацыі дапамогі маламаёмасным сялянам, паляпшэнні санітарна-гігіенічнага стану вёскі і правядзенні мерапрыемстваў па прафілактыцы і прадухіленні інфекцыйных і эпідэмічных захворванняў. Земскія начальнікі інспектавалі стан школ і вучылішчаў, прымалі меры па яго паляпшэнні, а таксама садзейнічалі адкрыццю новых навучальных устаноў. Важнае значэнне адводзілася рамонту і будаўніцтву дарог, мастоў, брукаванню вуліц. Разам з тым, дзейнасць па рэалізацыі гэтых функцый не выявілася ў поўнай меры і шмат у чым залежала ад суб'ектыўных якасцей земскага начальніка. У той жа час некаторыя земскія начальнікі вялі актыўную працу, якая спрыяла адкрыццю школ, паляпшэнню бытавых умоў жыцця сялян, вырашэнню канфліктных сітуацый з валаснай і сельскай адміністрацыяй.

ЛІТАРАТУРА

1. Высочайше утвержденное Положение о земских участковых начальниках: 12 июля 1889 г., № 6196 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1891. – Т. 9. – С. 508–535.
2. Отчет о деятельности Минского уездного съезда, земских начальников и волостных судов Минского уезда за время с 1901 по 1903 гг. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 77.
3. Отчет о деятельности уездного съезда, земских начальников и волостных судов Игуменского уезда за время с 1 октября 1901 г. по 1 января 1903 г. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 76.
4. Отчеты о деятельности уездного съезда, земских начальников и волостных судов Речицкого уезда за время с 1 октября 1901 г. по 1 января 1903 г. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 79.
5. Отчеты о деятельности уездного съезда, земских начальников и волостных судов Слуцкого уезда за время с 1 октября 1901 г. по 1 января 1903 г. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 80.
6. Материалы об обследовании земскими начальниками санитарно-гигиенических условий народных училищ Минской губернии // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 282.
7. Отчеты о деятельности уездного съезда, земских начальников и волостных судов Мозырского уезда за время с 1 октября 1901 г. по 1 января 1903 г. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 78.
8. Каханоўскі А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 333 с.
9. Отчет о деятельности уездного съезда, земских начальников и волостных судов Борисовского уезда за время с 1 октября 1901 г. по 1 января 1903 г. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 75.
10. Папа-Афанасопуло И.А. Акт ревизии произведенной пинским уездным предводителем дворянства И. А. Папа-Афанасопуло во 2-м земском участке Пинского уезда 5–7 и 16, 17, 26, 27 августа 1908 г. – Минск: Губерн. тип., 1908. – 65 с.
11. Материалы о состоянии продовольственных средств и нужд населения в связи с градобитием в губернии // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 539.

*Паступіў 03.05.2024*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ЗЕМСКИХ НАЧАЛЬНИКОВ МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ ПО РЕШЕНИЮ СОЦИАЛЬНЫХ И ОБЩЕСТВЕННЫХ ВОПРОСОВ В ДЕРЕВНЕ В НАЧАЛЕ XX В. (ПО МАТЕРИАЛАМ ОТЧЁТОВ)

***канд. ист. наук А.А. СТРАЛЕНЯ***
***(Белорусский государственный университет, Минск)***

*В Российской империи в конце XIX в. была проведена реформа местного управления, в ходе которой была введена новая власть в сельской местности - институт земских начальников. Одним из направлений их деятельности стало решение основных проблем в крестьянской среде. Земские начальники отвечали за проведение ревизий органов крестьянского самоуправления, решали вопросы землеустройства, обладали судебными полномочиями. Кроме того, должны были содействовать повышению грамотности среди сельского населения, открытию новых школ. В статье рассматривается роль земских начальников в решении социальных и общественных вопросов сельского населения, показана их практическая деятельность, направленная на повышение уровня грамотности, изменение отношения крестьян к получению образования.*

***Ключевые слова***: *земские начальники, административные и судебные учреждения, белорусские губернии, крестьянское самоуправление, образование.*

## ACTIVITIES OF DISTRICT CAPTAINS OF MINSK PROVINCE IN SOLUTION OF SOCIAL AND PUBLIC ISSUES IN VILLAGES AT THE BEGINNING OF THE 20TH CENTURY (BASED ON REPORTS)

***H. STRALENIA***
***(Belarusian State University, Минск)***

*In the Russian Empire at the end of the 19th century local government reform was carried out. Due to the reform a new authority for the rural areas was introduced – the institution of district captains. One of the areas of their activity was solving the main problems of the peasantry. District captains were in charge of conducting audits of peasant self-government bodies, solved the land management issues, had judicial powers. Furthermore, they were to promote rural literacy and opening of new schools. The article examines the role of district captains in solving social and public issues of the rural population, shows their practical activities aimed at increasing the level of literacy and changing the peasants' attitude to receiving education.*

***Keywords***: *district captains, administrative and judicial institutions, Belarusian provinces, peasant self-government, education.*